**Гаваўноўіч, В.** Кабульскае неба / В. Гавяйновіч // Полацкі веснік. — 2004. — 15 лют. — С. 1.

## КАБУЛЬСКАЕ НЕБА



**Яны прыбылі ў полк, і Мікалай Ступакоў убачыў на Дошцы гонару здымак свайго таварыша, з якім разам вучыліся ў Віцебскім авіяцыйным атрадзе, а пасля – у Сызранскім ваенным вучылішчы. Узрадаваўся. Хацеў хутчэй убачыць Міхаіла Хрыпача. Але пакуль раскватэраваліся, часу на сустрэчу не засталося. На наступны дзень заняткі з лётным саставам праводзіў камандзір палка. У гэты час яму і паведамілі, што збілі наш верталет.**

Мікалай не надаў асаблівага значэння гэтаму факту. Пасля заняткаў пайшоў шукаць свайго старога сябра. Вось-вось павінна была адбыцца сустрэча. Яны абодва з Беларусі: Мікалай Ступакоў нарадзіўся на Полаччыне, Міхаіл Хрыпач – на Ушаччыне. Столькі было расказаць адзін аднаму! У саслужыўцаў спытаў, а дзе можна знайсці Хрыпача?

– Ляжыць у ленпакоі...

І толькі тады Мікалай зразумеў, што ў збітым верталёце, аб якім паведамілі раніцой, і ваяваў яго зямляк.

Гэткай трагічнай навіной сустракаў яго Кабул. І ён зразумеў, што самае страшнае на вайне – губляць сваіх сяброў, сваіх аднапалчан.

З самага пачатку кабульскае неба ўражвала сваёй бязвоблачнасцю. Але ў яго блакіт яны не вялі свае Мі-24. Наадварот, лёталі на гранічна нізкіх вышынях, у 15 метрах ад зямлі. Вайна. Нечаканасці падсцерагалі ўсюды. Бывалі дні, калі экіпаж верталёта знаходзіўся ў паветры па 6 гадзін. Вялі паветраную разведку, суправаджалі транспартна-баявыя верталёты на заставы. Пакуль Мі-8 разгружалі, кружылі ў паветры, ахоўвалі. Іх эскадрылля забяспечвала пасадку ў Кабуле транспартных самалётаў з Саюза.

Неяк у час аднаго з абстрэлаў аэрадрома ракета трапіла ў ленпакой суседняй эскадрыллі. У выніку – 9 забітых і 56 параненых. І зноў лётчыкі праводзілі «Груз 200».

Ці было страшна на вайне? Мікалай Міхайлавіч гаворыць, што пра гэта ён увогуле не думаў. І з усмешкай дадае: «Можа таму і выжыў...»

У Кабуле ён служыў з лістапада 1988 года па люты 1989. За гэты час іх экіпаж зрабіў 150 баявых вылетаў. Мікалая Ступакова ўзнагародзілі ордэнам Чырвонай Зоркі.

Вайна заканчвалася, і іх полк пакідаў Кабул. Шлях ляжаў цераз перавал Саланг. У разведку паляцеў камандзір. А праз некаторы час сувязь з верталётам была згублена Далі адбой на вылет. Верталёт камандзіра не вярнуўся і праз суткі. Тыдзень стаяла нялётнае надвор'е. Экіпаж на чале з камандзірам палка загінуў. І гэта былі апошнія дні Афганскай вайны...

Пасля Мікалай Ступакоў служыў у Забайкальскай ваеннай акрузе, у Германіі. Затым – вывад войск. Перавялі ў Вязьму. Лётная кар'ера скончылася, а служыць на зямлі не пажадаў. Падаў рапарт аб звальненні ў запас. Дый Саюз, як кажа ён, пачалі дзяліць. Вярнуўся з сям'ёй дамоў, у вёску Гараны.

Цяпер былы лётчык – майстар кацельні. Яго паважаюць, умее выдатна ладзіць з людзьмі. Не забывае старых сяброў. З іх выпуску ваеннага вучылішча на вайне загінуў кожны дзесяты. З Наваполацка яны прызываліся ўчатырох, не вярнуліся з вайны Міхаіл Хрыпач і Уладзімір Ягораў...

У Мікалая і Алены Ступаковых падрастае сын Сяргей. Бацька не супраць, калі сын захоча быць лётчыкам.

**В. Гавяйновіч**